# ЛІТАРАТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ

У XVIII ст. у літаратуры беларускіх зямель шырока замацавалася польская мова. Пад уплывам Асветніцтва з′яўляюцца творы класічнага і сентыментальнага характару. Зварот да народнай гутаркі назіраўся ў такіх званых «нізкіх» драматургічных жанрах. Напрыклад, у пастаноўках ***Каятана Марашэўскага*** і ***Міхала Цяцерскага*** выкарыстоўвалася беларуская мова. У забельскім калегіуме на Віцебшчыне яны арганізавалі школьны тэатр. У беларуска-польскай «Камедыі» К. Марашэўскі паказаў цяжкае жыццё прыгоннага селяніна Дзёмкі. М. Цяцерскі ў камедыі «Доктар па прымусу» стварыў цікавыя вобразы беларускіх сялян Хведара і Апанаса.



# «КАМЕДЫЯ» К. МАРАШЭЎСКАГА

Пачатак перыядычнаму друку ў Беларусі і Літве паклаў ***Ян Пашакоўскі*** (1684 - 1757). Ён выкладаў філасофію, граматыку і багаслоўе ў Коўне, Вільні, Нясвіжы, выхоўваў сыноў магната Міхала Казіміра Радзівіла (Рыбанькі). Галоўнай справай жыцця Яна Пашакоўскага стала выданне календароў. Толькі ў Вільні на працягу 1737 – 1749 гг. ён апублікаваў дваццаць «Палітычных каляндарыккаў». Адзін з іх прызначаўся для жанчын, што не было ўласціва гэтаму часу. У календарах крытыкавалася геліяцэнтрычная сістэма М. Каперніка, пералічваліся астранамічныя з'явы, называліся найважнейшыя падзеі з гісторыі ВКЛ і Польшчы.



# ЯН ПАШАКОЎСКІ

У другой палове XVIII ст. выданне «Палітычных каляндарыкаў» працягнуў у Вільні ***Францішак Папроцкі*** (1723 – 1805). Ён таксама выдаваў і рэдагаваў штотыднёвік на польскай мове *«Кур'ер Літэўскі»*, у якім змяшчаў шмат матэрыялаў з Беларусі. У гэтым выданні Папроцкі надрукаваў невялікую кнігу К. Галоўкі «Хатнія звесткі пра Вялікае Княства Літоўскае». Яна стала першай энцыклапедыяй, паколькі давала інфармацыю па геаграфіі, прыродзе, гісторыі беларуска-літоўскіх зямель.



# ФРАНЦІШАК ПАПРОЦКІ

Першым перыядычным выданнем на тэрыторыі Беларусі лічыцца польскамоўная *«Газэта Гродзеньска».* Яе першы нумар выйшаў у маі 1776 г. На дзвюх старонках змяшчалася інфармацыя пра найбольш значныяпадзеі ў Рэчы Паспалітай і свеце, асвятлялася мясцовае жыццё, друкаваліся аб′явы. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятроўскі ўвёў пасаду цэнзара, які замяняў «ненадзейныя» для ўрада артыкулы паведамленнямі з іншых выданняў.



Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# Гродненская ПРАВДА

Орган Гродненского обкома и горкома Коммунистической партии Белоруссии, областного и городского Советов депутатов трудящихся

Издается с сентября 1939 года

СУББОТА 11 НОЯБРЯ 1972 года

№ 224 (7677)

Цена 2 коп.

Указ Президиума Верховного Совета

О НАГРАЖДЕНИИ тов. ФОМЧЕНКОВА ПОЧЕТНОЙ ГРАМОТОЙ ВЕРХОВНОГО СОВЕТА БЕЛОРУССКОЙ ССР

9 ноября 1972 года, гор. Минск.

## МЫ — СОВЕТСКИЕ ЛЮДИ

В. МАЛОВА.

В. ПОЛИШЕВИЧ.

## «ГАЗЭТА ГРОДЗЕНЬСКА»

# КАНЕЦ